ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
25
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 34 (1372)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

## НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

прайшла на гістарычным факультэце. Яна была прысвечана 40-годдзю разгрому нямецка-фашысцкіх войск пад Сталінградам.

Адкрыла канферэнцыю дэкан гістарычнага факультэта, доктар гістарычных навук, прафесар І. В. Царук.

Пра бессмяротны подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны расказаў старшыня савета ветэранаў БДУ імя У. І. Леніна І. В. Марчанка, пра гераізм савецкіх воінаў у Сталінградскай бітве—Герой Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі, пра Сталінградскую бітву і партызанскі рух у Беларусі — загадчык сектара гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Інстытута гісторыі АН БССР Э. Ф. Языковіч.

З глыбокім хваляваннем слухалі прысутныя ўспаміны ўдзельнікаў гераічнай бітвы на Волзе старшыні мінскай секцыі ветэранаў вайны генерал-маёра В. І. Сінчыліна, доктара гістарычных навук, прафесара БДУ імя У. І. Леніна Г. М. Трухнова.

А. РУКШЫН,
супрацоўнік бібліятэкі.

## ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ПРАФКОМА

разгледзеў пытанні аб рабоце грамадскай юрыдычнай кансультацыі ў 1982 годзе, аб выніках справаздач і выбараў у прафсаюзных арганізацыях супрацоўнікаў.

На пленуме рашэннем прафсаюзнага камітэта створана школа прафсаюзнага актыву, у якую ўваходзяць трынаццаць вучэбных груп па напрамках прафсаюзнай работы. Кіраўніком школы назначаны намеснік старшыні прафкома, дацэнт В. Т. Шалатонін. Для метадычнага кіраўніцтва школай створаны метадычны савет, узначаліць які даручана члену арганізацыйна-масавай камісіі, дацэнту П. І. Зялінскаму. На пленуме зацверджаны таксама тэматычны план і расклад заняткаў школы прафсаюзнага актыву на 1982—1983 навучальны год

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

## ЧЭМПІЁНАМІ

факультэта журналістыкі па футболу сталі студэнты першага курса. Гэта ўжо другі буйны поспех першакурснікаў: раней яны заваявалі кубак газеты «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» за перамогу ў асеннім лёгкаатлетычным кросе.

В. БАГДАНОВІЧ,
студэнт журфака.

## ЧЫТАЧ ПРАЦЯГВАЕ РАЗМОВУ:
## Быць на перадавой. Што гэта значыць?

## Ні дня без адкрыцця!

УСЯ НАША КРАІНА жыве ў чаканні вялікага свята — 60-годдзя ўтварэння СССР. Гэтай даце прысвячаюць сваю працу гарнякі і металургі, механізатары і паляводы — усе, хто стаіць ля станка і вырошчвае хлеб.

Напружанымі працоўнымі буднямі жыве і Беларускі дзяржаўны універсітэт. Лекцыі, семінары, планы, сустрэчы, знаходкі... Кожны наш студэнцкі дзень — гэта падрыхтоўка да працы, якая чакае нас пасля заканчэння універсітэта.

Што ж азначае для студэнта быць на перадавой? Ці толькі штодзённае канспектаванне лекцый і падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў? Так, гэта галоўнае, гэта наша работа, наша заяўка на будучае. Добра вывучаная тэма, выдатны адказ на экзамене, зроблены цікавы даклад на студэнцкай навуковай канферэнцыі — і пазнана, зразумета нешта новае, неабходнае. Дэвізам кожнага студэнта павінны стаць словы «ні дня без адкрыццяў!». Мы выходзім са сцен БДУ не проста спецыялістамі сваёй справы. Дыплом выпускніка універсітэта падразумявае і высокую культуру, эрудыцыю, шырокі кругагляд. Калі ў студэнта ёсць дастатковая тэарэтычная база, калі ён прымаў удзел у студэнцкай навукова-даследчай рабоце, то, стаўшы інжынерам на прадпрыемстве, супрацоўнікам НДІ ці педагогам, малады спецыяліст хутчэй увойдзе ў новы калектыў і прынясе яму значную карысць, яго не трэба будзе пастаянна кантраляваць і вучыць працейшаму. Ён ужо знаёмы і з навуковай работай, цікавіўся навейшымі метадамі даследаванняў, хутка арыентуецца ў новых абставінах. Значыць, гады вучобы ва універсітэце не прайшлі дарэмна. Яны былі гадамі напружанай працы, бесперапыннага назапашвання ведаў, пастаяннага набыцця неабходных навыкаў. І калі ў ВНУ студэнт знаходзіўся на перадавых пазіцыях, то і ў працоўным калектыве такі чалавек будзе ў ліку перадавікоў.

Выраслі ў наш час патрабаванні і да спецыялістаў-географаў, да іх прафесіянальнай падрыхтоўкі. На парадку дня стаіць пытанне аб выпуску спецыялістаў, здольных працаваць у сумежных галінах навукі: біягеографаў, эканомгеографаў. Гэта патрабаванне сённяшняга дня. Такія спецыялісты неабходны вытворчасці, і яны абавязкова будуць падрыхтаваны. Гэта патрабуе ад студэнтаў яшчэ большай аддачы, зацікаўленасці, працавітасці і адказнасці. Выйсці са сцен універсітэта спецыялістамі высокай кваліфікацыі, патрэбнымі ў любой галіне народнай гаспадаркі — вось галоўная задача студэнта. А для нас гэта і значыць — быць на перадавой.

А. ДАМІНІКОЎСКАЯ,
студэнтка геафака.

## Знайдзі сваю справу!

ШТО ЗНАЧЫЦЬ БЫЦЬ НА ПЕРАДАВОЙ? Ён не так часта задумваецца над гэтым пытаннем. Для яго перадавая асацыіруецца з грандыёзнай грамадска-палітычнай дзейнасцю, з тытанічным напружаннем думкі, якая вядзе за сабой масы. Ён жа ніколі не быў важаком у калектыве, няма ў ім, здаецца, запалу арганізатара. Што ж адказаць на пастаўленае пытанне?

Віктар Драгун — студэнт другога курса механіка-матэматычнага факультэта. Хлопец зусім непрыкметны, знешне сціплы, нават, здаецца, нерашучы. Калі прапанавала яму крыху расказаць пра сябе, пачула сухі адказ: «У школе быў, як і ўсе: не лепшым і не горшым». Абітурыенцкае лета. Уступныя экзамены ён здаў з добрымі адзнакамі. Першы курс, заняткі, сябры, сесіі.

Гэта старонкі яго васемнаццацігадовага жыцця. Разважай не разважай, а вывад напрошваецца сам сабой: нічым, нідзе не вылучаўся Віктар з асяроддзя сваіх аднакурснікаў. Галоўная задача для яго — вучоба. І хоць не здзіўляў ён сваімі ведамі членаў прыёмнай камісіі, не былі сенсацыйнымі тэмпы засваення ім новага матэрыялу, а адказы ў час здачы першых дзвюх сесій былі далёка не бліскучыя і не бездакорныя, хлопец упарта крочыў наперад, пазнаючы кожны дзень шмат новага, адкрываючы для сябе таямніцы матэматыкі.

На пытанне, ці займаецца спортам, пачула: «Як усе». Памаўчаўшы, Віктар дадаў: «Удзельнічаю ў масавых спаборніцтвах». Грамадская работа? На першым курсе пастаянных даручэнняў не было, часовыя заўсёды выконваў з задавальненнем: справы зблізілі з таварышамі. Сёлета Віктара выбралі адказным за ваенна-патрыятычную работу ў групе.

Нейкая нерашучасць на твары, ледзь прыкметнае хваляванне. Расказвае, якія мерапрыемствы запланаваў правесці: лекцыі па ваенна-патрыятычнаму выхаванню, наведанне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, сустрэчы з ветэранамі. А што яшчэ прыдумаць такое, што прайшло б цікава, засталося ў памяці надоўга?

Думай, разважай, Віктар! Таварышы па групе далі табе адказнае даручэнне. Вось яна, твая перадавая!

Заўтра, ці то праз тыдзень, я ўпэўнена, прыдумае Віктар штосьці такое, захапляючае, адметнае, асабіста вынашанае. Упэўнена, не заспакоіцца, пакуль не знойдзе рашэння.

А. ГРЫШКЕВІЧ,
студэнтка журфака.





АДБЫЛОСЯ размеркаванне пяцікурснікаў вытворчага патока факультэта прыкладной матэматыкі. У зале — члены камісіі, прадстаўнікі прадпрыемстваў, навукова-даследчых інстытутаў, іншых устаноў. Ідзе разгляд заявак, апошнія ўдакладненні.

Пяць гадоў назад гэтыя юнакі і дзяўчаты прыйшлі на першую лекцыю. За гэтыя пяць студэнцкіх гадоў было яшчэ шмат лекцый, практычных заняткаў і семінараў, залікаў і экзаменаў. Цяпер яны — выпускнікі універсітэта, заўтра — маладыя спецыялісты: інжынеры, вучоныя. Гонар нашага універсітэта, прадстаўнікамі і выхаванцамі якога яны застануцца назаўсёды.

А пакуль што 302 студэнты сабраліся ля дзвярэй, за якімі працуе камісія, дзе дадуць ім канкрэтную пуцёўку ў жыццё. Па выкліку адчыняюць дзверы.

— Шапялюк Таццяна Пятроўна. Агульны бал — 4,72. Кафедра матэматычнага забеспячэння АСК,—зачытвае член камісіі.—Прымаецца рашэнне накіраваць студэнтку на гадзіннікавы завод «Прамень»...

**На здымках:** працуе размеркавальная камісія; Уладзімір і Таццяна **Гайдышы** будуць працаваць на заводзе ў Навапалацку.

В. ШАЧАК.
Фота аўтара.

ПРАКТЫКА

# ЦІКАВА І ЗМЯСТОЎНА

ЗА ВОКНАМІ ЛІСТАПАД. А здаецца, зусім нядаўна была вясна, летняя сесія. І цікавыя планы: шмат што хацелася зрабіць, шмат дзе пабываць. Для студэнтаў II курса геаграфічнага факультэта лета—гэта, акрамя ўсяго, яшчэ і час дальняй вучэбнай практыкі. Маршруты — самыя разнастайныя. Ад Карпат і да Байкала, ад Карэліі і Баранцава мора да Каўказа і Сярэдняй Азіі.

Наша падарожжа пачалося з Ленінграда — горада, дзе здзейснілася рэвалюцыя, дзе на кожным кроку — гісторыя. За тры дні, на працягу якіх мы знаёміліся з Ленінградам, у нас адбылося шмат цікавых падзей, сустрэч, экскурсій. Мы пабывалі ў Эрмітажы, Кунсткамеры, у этнаграфічным музеі імя М. М. Міклухі-Маклая. Хвілінай маўчання ўшанавалі памяць герояў рэвалюцыі, памяць абаронцаў і жыхароў Ленінграда, загінуўшых у блакаду.

Далей наш шлях ляжаў у Карэлію — край азёраў. У сталіцы Карэльскай АССР горадзе Петразаводску мы пазнаёміліся з гісторыяй і дасягненнямі гэтай рэспублікі за гады Савецкай улады. З лекцый, якія прачыталі навуковыя супрацоўнікі Карэльскага філіяла АН БССР кандыдаты геолага-мінералагічных навук А. Д. Лукашоў і І. М. Экман, мы даведаліся аб геалагічнай будове і развіцці рэльефу сучаснай Карэліі, тэрыторыя якой неаднаразова пакрывалася ледніком.

У Мурманску праграма практыкі была таксама вельмі насычанай: экскурсія ў порт, знаёмства з тэхналогіяй здабычы і апрацоўкі рыбы, паездка на падземную электрастанцыю «Верхняя Тулома». У Архангельску мы наведалі дрэваапрацоўчы камбінат імя У. І. Леніна, якому ў мінулым годзе споўнілася 100 гадоў. Прадукцыя гэтага прадпрыемства добра вядома як у нас у краіне, так і за яе межамі. Пабывалі і на радзіме вялікага рускага вучонага і паэта Міхаіла Васільевіча Ламаносава ў вёсцы Ламаносава пад Халмагорамі.

Як адно імгненне праляцелі дваццаць дзён практыкі. Шчырае дзякуй хацелася б сказаць нашым кіраўнікам: загадчыку галіновай лабараторыі возеразнаўства старшаму выкладчыку Валерыю Антонавічу Калечыцу і загадчыцы музея агульнага землязнаўства геаграфічнага факультэта Эме Андрэеўне Анемпадзіставай, якія зрабілі ўсё неабходнае, каб наша практыка прайшла цікава і змястоўна.

**І. НАУМАЎ,**
**І. ПРАКАПОВІЧ,**
**студэнты геафака.**



## Сёння — якасць ведаў і навыкаў, заўтра — эфектыўнасць працы

ІДЗЕ чарговае пасяджэнне навуковага гуртка па гісторыі КПСС. Кіраўнік, кандыдат гістарычных навук Сяргей Васільевіч Плужнікаў, запрасіў выступіць перад членамі гуртка былых студэнтаў, а цяпер маладых вучоных Анатоля Аркадзьевіча Разанава і Анатоля Афанасьевіча Тозіка.

А. А. Разанаў — выкладчык кафедры, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ. Цяпер даследуе праблемы міжнароднага камуністычнага руху.

А. А. Тозік — выпускнік гістфака 1971 года, кандыдат гістарычных навук, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі гэтага года.

Абодва, будучы студэнтамі, наведвалі гэты гурток. Госці расказалі аб ролі гуртка ў станаўленні вучонага, аб сваёй рабоце, сваіх планах, адказалі на пытанні, пажадалі студэнтам поспехаў у навуковым пошуку.

**В. ВАСІЛЬЕЎ.**
Фота **аўтара.**




У «ЛАБАРАТОРЫІ» ВЫДАТНІКА

# З ЧАСАМ НА «ТЫ»

МЯНЕ ЗАЎСЁДЫ ЦІКАВІЛА, ці хвалююцца сапраўдныя, са «стажам», выдатнікі ў час сесіі? Што датычыць стажу, то ў Сашы Малярэвіча — студэнта IV курса фізічнага факультэта ён багаты: 10 гадоў у школе і амаль чатыры — ва універсітэце. А наконт сесіі Саша мяне супакоіў: і выдатнікі хвалююцца, хаця асабіста яму сесія падабаецца. Яна дае магчымасць праявіць сваю самастойнасць.

Аднак, упэўненая, што здольнасці чалавека найбольш ярка праяўляюцца ў экстрэмальных абставінах (а што можа быць для студэнта «экстрэмальней» сесіі?), я не адставала: «Дык чым жа адрозніваецца выдатнік ад «простых смяротных», можа, неяк па-асобаму рыхтуецца ці яшчэ якія-небудзь сакрэты ёсць?».

— Адрозніваецца, напэўна, тым, — смяецца Саша, — што выдатніку заўсёды хапае таго самага апошняга дня напярэдадні экзамена, які патрабуецца астатнім.

— А як гэта зрабіць, каб хапала? Дарэчы, ты начамі вучыш?

— Вось чаго не раблю, дык гэта начамі не працую, дастаткова і светлага часу сутак. Навошта ж сябе мучыць.

Мне засталося толькі зайздросна ўздыхнуць, успомніць гару падручнікаў на стале, начную цішыню і гадзіннік, стрэлкі якога заўсёды бягуць неяк вельмі хутка...

— Усё ад неарганізаванасці, — тлумачыць Саша.—Дрэнныя звычкі ламаць даволі цяжка, але раю паспрабаваць і аднойчы ўсе важныя справы пачаць рабіць зранку. Ёсць у народаў Усходу мудрая прыказка: у непачатай справе змяя сядзіць. Сапраўды так: чым далей справу тую адкладваеш, тым страшней за яе ўзяцца.

— Кажуць, што Чарльз Дарвін на пытанне, як ён стаў славутым, некалі адказаў: «Я ніколі не лічыў паўгадзіны малым адрэзкам часу». Нешта ў гэтым ёсць. Але... увесь час сябе пераадольваць? Што гэта за жыццё?

— Гэта толькі на першым часе цяжка, — супакойвае Саша. — Патрэбна проста знайсці разумныя суадносіны паміж «хачу» і «трэба», астатняе дабавіцца.

— А калі каханая дзяўчына спатканне табе назначыла, а ты якраз у гэты вечар папрацаваць збіраўся?..

— Ну, дзяўчына ні ў якім выпадку чакаць не павінна.

— Атрымліваецца, «трэба» не заўсёды пераважае?

— Атрымліваецца... Але невядома, што ў гэтай сітуацыі сапраўды «трэба».

Пра сваю навуковую работу Саша гаворыць не вельмі ахвотна. Ён лічыць, што зрабіў яшчэ вельмі мала і што наогул студэнту-фізіку неабходна займацца навукай хаця б для таго толькі, каб далучыцца да шматлікіх прылад, набыць неабходныя тэхнічныя навыкі. Яго грамадская дзейнасць цесна пераплятаецца з навуковай. Саша — адказны за навукова-даследчую работу студэнтаў. У кола абавязкаў уваходзяць і арганізацыя экскурсій на факультэцкія кафедры для першакурснікаў, і падрыхтоўка навуковых канферэнцый. Дарэчы, у апошніх актыўна ўдзельнічае сам.

— Саша, а чаму ты выдатнік? «Харашыстам» быць прасцей, і часу на адпачынак больш застаецца. Можа, уся справа ў славалюбстве?

— Вядома, на «4» і «5» вучыцца прасцей, а вось наконт вольнага часу не згодны. І наогул не люблю, калі часта скардзяцца, што яго не хапае. Зноў паўтару: уся справа ў арганізацыі. Навуковай арганізацыі працы!

— Скажы, а хоць адна «чацвёрачка» ў цябе была?

— Была. Але гэта не па справядлівасці атрымалася. Мне здаецца, я ведаў на «пяць».

Студэнт застаецца студэнтам, нават калі ён выдатнік...

Размова наша зацягнулася, і калі Саша сказаў, што асабліва цэніць у людзях сціпласць, я зразумела: каменьчык у мой агарод. Але, рызыкуючы пakaзацца нетактоўнай, усё ж задала апошняе пытанне:

— У чым ты бачыш асноўны сэнс паняцця «выдатнік»?

— Гэта чалавек (не толькі вучань ці студэнт, трэба браць шырэй), якому выдатная адзнака патрэбна не сама па сабе, а як нейкае пацвярджэнне: працуеш добра, разважаеш цікава. Адзнака дзеля адзнакі? Гэтага не разумею.

**Н. КАЛІШЭВІЧ,**
**наш кар.**

ЗВЫЧАЙНАЯ лекцыя. Калі не лічыць, што для першакурснікаў геафака геаграфія — самая лепшая, самая цікавая навука. Таму кожная лекцыя для іх — незвычайная.

Цыкл лекцый «Агульнае землязнаўства» чытае прафесар Вольга Піліпаўна Якушка. Спачатку кароткая аб'ява аб чарговым пасяджэнні навуковага гуртка, затым Вольга Піліпаўна пачынае новую тэму: «Сусветны акіян» — аб гідрасферы, аб асноўных фізічных уласцівасцях вады, аб жывых арганізмах...

Студэнты не адрываюцца ад канспектаў. Разумееш першакурснікаў: у іх хутка сесія. Самая першая і самая цяжкая, да якой трэба дасканала падрыхтавацца.

**В. КАСЦЮКЕВІЧ.**
Фота **аўтара.**





**На днях да нас у рэдакцыю завітаў стары знаёмы —ЛІХТАРЫК. Нядаўна яму споўніўся год. Мы віншуем Ліхтарыка з гэтым маленькім юбілеем і прапануем увазе чытачоў некалькі матэрыялаў, падрыхтаваных «пражэктарыстамі» універсітэта з яго дапамогай.**

# «ДОБРЫ ДЗЕНЬ І... БЫВАЙ?!»

ГЭТЫМ загалоўкам Ліхтарык зусім не збіраецца запрасіць чытачоў на рэтраспектыўны прагляд вядомай кінастужкі пад такой жа назвай. Але, на яго погляд, своеасаблівы ўплыў моднага сучаснага стылю «рэтра» адчуваецца не толькі ў адзенні, музыцы ці мастацтве...

Хто не помніць знаёмае з пачатковай школы: «Мы пісалі, мы пісалі...»?! Ружовым успамінам бязвоблачнага дзяцінства суджана было вярнуцца, уліцца ў імклівую плынь жыцця сённяшніх студэнтаў у выглядзе крыху непрывычнага тэрміну «фізкультпаўза». Іменна так назвалі штодзённую «пяцімінутку» ў канцы другой пары заняткаў, на працягу якой студэнты павінны выканаць 5—6 фізічных практыкаванняў. Спецыялісты фізвыхавання, медыкі недарэмна лічаць, што такая размінка дапамагае знімаць стомленасць, павышае працаздольнасць і ў канчатковым выніку выклікае паляпшэнне засваення інфармацыі. А калі ўлічыць, што 10—12 працэнтаў першакурснікаў універсітэта вымушаны наведваць групы лячэбнай фізкультуры, значэнне «пяцімінуткі» цяжка пераацаніць.

У канцы красавіка гэтага года «Беларускі універсітэт» павіншаваў спартсменаў, усіх студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна з «заканадаўчым» увядзеннем фізкультурнай паўзы, пажадаў гэтаму «мерапрыемству» добрага шляху і доўгага жыцця. Прайшло больш як паўгода. І што ж? Сёлетнія першакурснікі не чулі яшчэ тэрміну «фізкультпаўза». Прыходзіцца спадзявацца толькі на тое, што іх успаміны аб ружовым дзяцінстве пакуль што больш яскравыя, чым у студэнтаў старэйшых курсаў. А як жа быць старшакурснікам? Бязлітасны час можа сцерці з памяці апошнія старонкі ўспамінаў пра клопаты, накіраваныя на ўмацаванне іх здароўя. Ці разлічваць, што ўсемагутны стыль «рэтра» яшчэ раз зробіць свой загадкавы паварот?

Ліхтарыку хацелася б ведаць, што ж думаюць аб гэтым спартыўныя бюро факультэтаў, спортклуб БДУ?

# ПРА «ЧЫТАЧОЎ» І «ПІСЬМЕННІКАЎ»

НАШ НАРОД па праву лічыцца самым чытаючым у свеце. Да яго паслуг — тысячы бібліятэк і мільёны тамоў. У шэрагу тваіх лепшых сяброў, студэнт, — бібліятэка БДУ імя У. І. Леніна. Яе фонды налічваюць сёння звыш 1700 тыс. тамоў. Штогод набываецца 60—80 тысяч новых экземпляраў, у тым ліку звыш 20 тысяч падручнікаў. Аддзел вучэбнай літаратуры абслугоўвае звыш 9 тысяч чытачоў, а аддзел навуковай і мастацкай літаратуры— каля 16 тысяч. Такі велізарны аб'ём работы патрабуе не толькі напружання сіл ад супрацоўнікаў бібліятэкі, але і яснага разумення свайго месца ў ланцугу «бібліятэка — кніга — чытач» ад цябе, студэнт.

Нядаўна Ліхтарык пазнаёміўся з работай бібліятэкі крыху бліжэй. У першую чаргу яго цікавілі цяжкасці, вузкія месцы, якія перашкаджаюць рабоце з кнігай. Высветлілася, што супрацоўнікам бібліятэкі штогод даводзіцца спісваць каля трох тысяч кніг, выведзеных з карыстання з-за неахайных адносін студэнтаў. Амаль такая ж колькасць кніг штогод губляецца на абанеменце навуковай і мастацкай літаратуры. Зарэгістраваны выпадкі наўмыснага псавання кніг, спробы «захапіць» падручнікі з чытальных залаў і г. д. Вось што напісаў у рэдакцыю першакурснік факультэта журналістыкі В. Чарняўскі: «...вялікая розніца: чытаць і быць чытачом...» (гэта радок з артыкула «Аб чытанні кніг» у адным з маскоўскіх часопісаў). Вялікая розніца. Выражаецца яна таксама і ў адносінах да кнігі, і ў адказнасці перад ёй і яе будучымі чытачамі.

«Чытач», пра якога я хачу расказаць, чалавек сур'ёзны. Ён выдатна разумее не толькі задуму аўтара, але і сам здольны «дапісаць» працяг сюжэта. Іменна такі «чытач», смела рэдагуючы кнігу на яе палях, відаць, карыстаўся падручнікамі, даведнікамі і першакрыніцамі, якія атрымалі ў гэтым годзе многія першакурснікі».

Праблемай стала ў бібліятэцы і славутая запазычанасць. Уведзены ў 1974 годзе групавы метад абслугоўвання добра зарэкамендаваў сябе.

Прыходзіць у пачатку навучальнага года ўся акадэмічная група на абанемент, а там ужо ўсё для кожнага падрыхтавана. Некалькі хвілін — і кнігі, неабходныя для заняткаў, набыты. Аналагічна павінна выглядаць і працэдура вяртання кніг. Павінна, але... Старасты акадэмічных груп чамусьці часта забываюць пра гэты, адваротны бок групавога метаду абслугоўвання. Толькі летам 1982 года звыш дзвюх тысяч студэнтаў не разлічыліся своечасова з бібліятэкай. А гэта значыць, што столькі ж іх таварышаў засталося без неабходных падручнікаў. Асабліва востра стаіць праблема «запазычанасці» на старэйшых курсах. Супрацоўнікі бібліятэкі выказалі аднадушную думку: даўно неабходна арганізаваць больш цвёрды кантроль за здачай вучэбнай літаратуры з боку камітэтаў камсамола і прафбюро факультэтаў. І тады «прапаўшыя» экземпляры зноў апынуцца на бібліятэчных паліцах.

**У падрыхтоўцы матэрыялаў сённяшняга выпуску ЛІХТАРЫКУ дапамагалі члены універсітэцкага штаба «КП» І. Зыбайла, В. Зайчыкава, І. Мамедаў.**

# У інтарэсах здароўя кожнага

ЯШЧЭ ў першыя дні існавання Савецкай дзяржавы партыя бальшавікоў і яе правадыр Уладзімір Ільіч Ленін вялікую ўвагу ўдзялялі ахове здароўя працоўных, разумеючы, што здароўе народа — багацце дзяржавы.

І вось цяпер, калі Савецкая ўлада існуе 65 гадоў, можна з упэўненасцю сказаць: мы дасягнулі грандыёзных вышынь у развіцці прамысловасці, навукі, тэхнікі, культуры, медыцыны. У нашай краіне поўнасцю ліквідаваны хваробы, што забіралі некалі сотні і тысячы чалавечых жыццяў, больш чым у два разы павялічылася працягласць жыцця. На кожным з'ездзе партыі разам з важнейшымі пытаннямі камуністычнага будаўніцтва разглядаюцца таксама і пытанні аховы здароўя.

Здароўе — самае каштоўнае багацце, якім надзяліла чалавека прырода. Але, на жаль, не вечнае. Многа ў яго ворагаў: хваробы, траўмы... Таму берагчы яго трэба кожны дзень, кожную гадзіну, кожную хвіліну.

Здараецца, пагражае яму і страта вялікай колькасці крыві — жывы арганізм слабее. І вось тады на дапамогу хвораму прыходзяць людзі, пра якіх сказана — і скажуць яшчэ! — шмат добрых слоў, — на дапамогу прыходзяць донары.

Але ў каго браць кроў для пералівання? І якую колькасць яе можна ўзяць у донара, не падрываючы яго здароўя? У недалёкім мінулым кроў бралі ў сваякоў і блізкіх хворага. Ды толькі не заўжды яна адпавядала групе, патрэбнай для пералівання.

Таму ў медыцынскіх установах неабходна было стварыць вялікі запас крыві розных груп. Толькі гораду Мінску для лячэбных мэт неабходна штодзённа кроў 500—800 чалавек.

Сёння тысячы і тысячы савецкіх грамадзян горада лічаць сябе донарамі. Ёсць сярод іх і вялікая колькасць выкладчыкаў і студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна. Больш за дваццаць пяць разоў здаваў кроў былы студэнт юрыдычнага факультэта У. А. Лузан — Ганаровы донар СССР. Дваццаць адзін раз здавала кроў супрацоўніца універсітэта М. М. Аляксандрава. Сярод студэнтаў-донараў можна назваць трэцякурснікаў радыёфізічнага факультэта А. Курловіча, Л. Шыдлоўскую, студэнтаў-юрыстаў І. Матусевіч, В. Некрашэвіч, будучых гісторыкаў Ю. Шыпалава, Ф. Пазнякова і многіх іншых.

У мінулым годзе 2500 студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна бясплатна здалі кроў, сёлета больш за тысячу чалавек сталі донарамі.

29—30 лістапада ў БДУ імя У. І. Леніна праводзіцца Дзень донара. Абавязак кожнага з нас — прыняць актыўны ўдзел у здачы крыві, якая спатрэбіцца для выратавання жыцця савецкіх людзей.

Камунізм будуюць не дзесятак асілкаў, а мільёны рабочых рук. Няхай жа будзе больш у нашай краіне смелых, спрытных, дужых, прыгожых, здаровых!

**М. БАЁК,**
**старшыня арганізацыі таварыства Чырвонага Крыжа БДУ імя У. І. Леніна, кандыдат медыцынскіх навук.**



Далёка за межамі рэспублікі вядомы навуковыя распрацоўкі і знаходкі супрацоўнікаў кафедры ядзернай фізікі. Тут падрыхтавана значная колькасць высокакваліфікаваных спецыялістаў-фізікаў. Трывалыя веды закладваюцца яшчэ ў студэнцкую пару.

**На здымку:** студэнты фізічнага факультэта Яўген Більдзюкевіч, Алег Місевіч і дацэнт кафедры У. А. Чудакоў у лабараторыі «Аўтаматызацыя навуковых даследаванняў».

Фота **В. Шачака.**

# Ружовы ранак

літаратурная старонка

## ЖУРФАК ПАЭТЫЧНЫ

НЕ АДЗІН год працуе на журфаку літаратурнае аб'яднанне «Рунь», якое ўзначальвае старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Мікалай Рыгоравіч Каваленка. Нядаўна ў літаб'яднанні адбыўся вечар паэзіі з удзелам гасцей— студэнтаў Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта, на якім прагучалі вершы на рускай, украінскай і беларускай мовах. «Рунь» прысвяціла гэту сустрэчу 60-годдзю ўтварэння СССР.

### Радзіслаў ЛАПУШЫН

* * *

Я вижу все, что захочу.
Уходит пригородный поезд.
Мне кажется, что я лечу.
Зовет меня далекий голос.
И я уже не здесь. А там,
Куда меня уносит снегом,
Я повстречаюсь с человеком,
Которому я все отдам.
Один — на всем моем пути.
Издалека пошел навстречу.
И я единственный замечу,
Как тяжело ему идти.
Ушанка съехала на лоб,
Пальто глухое —
нараспашку,
И ноги впутались в сугроб,
И снег стекает за рубашку.
Меня увидел и застыл.
И я объятий не раскрою.
Я испугался. Я забыл
Слова, придуманные мною.
Рука к руке. Глаза в глаза.
Так что же нас разъединяло?
И на двоих — одна слеза
На землю снежную упала.

* * *

Скоро ночь.
Мотоцикла слепящее око.
И на тысячу верст — никого.
А за ним по крупицам дорога
Гасит свет, догоняя его.
И еще ты услышишь, как
где-то
Вдруг заглохнет ревущий
мотор.
Будто дождь потушил
незаметно
На лугу одинокий костер...

* * *

Хочу бессонницы,
бессонницы!
Я слишком долго спал в
тепле.
Тысячелетия на совести.
И 20 лет! И 20 лет!

### АЛЕНА АЛІЕВА

* * *

Не лагодзяць сэрца болей
Жыта спелага палі,
І рамонкаў мне ніколі
Не знайсці, што адцвілі.
Не знайсці мне белых кветак,
Што растуць уздоўж дарог...
Харacтва былога лета
У духмяны зжата стог.

### ЛЕАНІД ПРАНЧАК

* * *

Світанне — маё жаданне.
Ноч адыходзіць прэч.
Насустрач юнаму ранню
Спяшаю ў лес Сустрэч.
Пульсуе сцяжыны вена
Туды, дзе лістоты парча,
Дзе я, апантаны, сустрэну
Сябе ў тваіх вачах.

### ЛЕАНІД САКАЛОЎ,

студэнт факультэта журналістыкі Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта.

* * *

Пройдут века, пройдут тысячелетья,
Но все равно: в мильон-мильонный раз —
Где б ни был человек иль сущность человечья —
По-новому среди обычных фраз
Вновь прозвучит в повторе бесконечном:
«Я Вас люблю. Я думаю о Вас!»

* * *

Погасили в вагоне свет.
Я стою и смотрю в окно.
По прошествии стольких лет
стало в мире опять темно.
Знать, такая моя судьба —
засмотревшись в ночную
темь,
за мелькнувшей тенью
столба
не заметить любимой тень.

#### СОСНА

Где дымится сухая крапива,
вдоль карьера дорога идет.
Здесь сползает сосна по
обрыву,
словно в землю обратно
растет.
Рядом — столько
нормальных сосен.
Целый лес — и прям, и
высок.
Отчего же эту заносит,
как заглатывает, песок?
Что ее так клонит и горбит,
Что затягивает в глубину,
и, как струны, лопают корни
за какую такую вину?
Край обрыва, как край
могилы.
Жутковато на дно смотреть.
Ну, а мне хватило бы силы
не сдаваться, жить, зеленеть?

### УЛАДЗІМІР СЯМЕНЧЫК

* * *

В городе шумно и сыро.
Город похож на квартиру,
где потолки протекают,
краской заляпан паркет,
ветер обои срывает,
туча полой протирает
яркий хозяйский портрет.
Пахнет знакомо и остро
хламом и мокрой известкой,
сваленным в кучи старьем.
Снова затеяла осень
перед ремонтом разгром,
и за белилами послан
кто-то в хозмаг за углом..



### ВАЛЯНЦІН ЖДАНКО

#### АД ЗЯМЛІ

Я часцінка твая, зямля,
Я ад нівы, што хлеб дае.
Я — твой колас. Мая
ралля —
Ты і дужыя плечы твае.
Каласок увайшоў у рост—
Ласку матчыну не здымі—
Напаі мяне ззяннем рос,
Ветрам цёплым мяне
абдымі.
Ніва родная — родны дом.
Тут я вырас і тут засну.
І ўпадзе зерне на дол,
Каб за мною сустрэць вясну.

#### З ДАРОГІ

Адчайны рух нервовых рук
Адценены акном.
І колаў дробны перастук
Зліваецца са сном.
Адцяты хуткасцю, назад
Мільгнуў халодны цень.
У цемры восеньскай
разлад —
Прыходзіць новы дзень.
Прыходзіць з сонечным
святлом,
З бязмежнасцю вышынь,
І настае рашучы злом
У млявасці душы.
Санлівых гмахаў грамада,
Як пагранічны строй.
Люструе ціхая вада,
Знаёмы воблік твой.



### ВІКТАР БАБЕЙ

* * *

Ляжыць каля сэрца пажоўклы з гадамі
Партрэт маёй маці у юнай пары.
Ён самы найлепшы, дарожайшы самы,
Якія б партрэты хто мне ні дарыў.
Я бачу — ляжаць аксамітныя косы
На тых непаўторных маленькіх плячах,
І свеціцца радасць, як раніцай росы,
У блакітнага колеру светлых вачах.
І, гледзячы ў гэтыя ясныя вочы,
Я бачу і помню ў далёкіх краях,
У цяжкія хвілі — куды б я ні крочыў,—
Цябе, дарагая матуля мая.

### АЛЕНА САЗАНОВІЧ

* * *

Звезду, что выше неба, как
мы ждали,
И часто выходили на балкон.
Впустую наши ночи
пролетали...
Раздался вдруг звезды
летящий звон.
А на земле — осколочки и
слезы
Слились, в ночи замолкнув
навсегда.
Рассеялись ночные наши
грёзы:
Разбилась на сырой земле
звезда.
Наивные, мы далью
восторгались,
Мы думали, что даль, как
благодать,
Но та звезда, что выше всех
поднялась,
Обречена быстрее всех
упасть.

### СТАНІСЛАЎ МАЕЎСКІ

#### ПАМЯЦІ БАГДАНОВІЧА

У чысціні снягоў бярозавых,
Сярод зялёнай цішыні
Твой голас сэрца заваражваў,
Мог боль дзявочы супыніць.
Здаецца, што ўчора раніцай
Спявалі жаўранкі табе,
А сёння ўжо камусьці
жаляцца,
Што ты пакінуў іх у журбе.
Пад вечар зноў маўклівай
зоркаю
Узыйдзе на родны небасхіл
Твая Венера сінявокая,
Каб ты сустрэўся з ёй,
Максім!

### МІХАСЬ СТЭЛЬМАК

* * *

Упаў пад ногі зоркай жоўтай ліст,
І вымавіла ты:
— Якая восень!
А я згадаў самотныя палі
У роднай вёсцы,
Пад аховай сосен
Імгненні бездакорнай нематы,
Хаваўшыя цяпло і пахі лета.
Тады ж адчуў, што значыш сэрцу ты,
І для абодвух нас
Што значыць гэта.

#### НА БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

Спыніся, дружа, і паслухай,
Як песня жаўрука
Услед спяшаецца за плугам
Вяскоўца-земляка.
Жыхар таёмнай Залацінкі,
Ты ў гэтым краі — госць,
Тут, дзе звінеў ручэй
дзяцінства,
Запомні ўсё, як ёсць:
Сінь трапяткую паднябесся,
Суседа па сяўбе,
Яшчэ запомні песню,
Песню,
Што тужыць па табе.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
25 лістапада 1982 г.
Зак. 2058. АТ 21596

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ